Беларускае гістарычнае таварыства

# 52

# Беларускі гістарычны зборнік

Беласток 2019

# Białoruskie Towarzystwo Historyczne

**Rada naukowa:**
prof. Ēriks Jēkabsons (Ryga),
prof. dr hab. Jan Jurkiewicz (Poznań), prof. dr hab. Ryhor Łaźko (Homel),
prof. dr David Marples (Edmonton), dr Rimantas Miknys (Wilno),
prof. dr Mathias Niendorf (Greifswald), dr Per Rudling (Singapur),
prof. dr hab. Zachar Szybieka (Hajfa), prof. dr hab. Jan Tęgowski (Toruń),
prof. Siarhiej Tokć (Grodno), prof. Barbara Törnquist-Plewa (Lund),
prof. dr hab. Andrzej Zakrzewski (Warszawa)

**Recenzenci nr 52:**
prof. Krzysztof Buchowski, prof. Siarhiej Tokć.

**Kolegium redakcyjne:**
Eugeniusz Mironowicz (redaktor naczelny), Dorota Michaluk (zastępca redaktora),
Luba Kozik (zastępca redaktora), Tomasz Błaszczak (sekretarz redakcji),
Oleg Łatyszonek, Witalis Łuba (red. językowy),
Jarosław Iwaniuk (red. strony internetowej),
Sławomir Iwaniuk, Małgorzata Ocytko

**Skład:** Adam Pawłowski
**Korekta:** Witalis Łuba
**Wydawca:** Białoruskie Towarzystwo Historyczne
**Adres redakcji:** 15-449 Białystok, ul. Proletariacka 11, tel. 85 744 61 11
**E-mail:** ebma@interia.pl
**Strona internetowa:** http://bzh.kamunikat.org
**Nakład:** 500 egz.

Zrealizowano:
- dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji,
- przy wsparciu finansowym Urzędu Marszałkowskiego Województwa Podlaskiego w Białymstoku

Ministerstwo Spraw Wewnętrznych i Administracji

Podlaskie

*Na okładce* (I strona): Konstanty Kalinowski,
(IV strona): Uroczystości pochówku przywódców i uczestników Powstania Styczniowego, Wilno 2019 (fot. racyja.com)

артыкулы

**Аляксей Ластоўскі**
(Мінск)

# Расавыя ідэі ў беларускім нацыяналізме пачатку XX ст.

Слова «расізм»[1] стала адным з самых заганных і страшных слоў у сучасным лексіконе, а расавыя ідэі былі цалкам дыскрэдытаваныя пасля Другой сусветнай вайны, асабліва пасля выкарыстання гэтых ідэй нацыстамі для апраўдання генацыду і масавых злачынстваў. Таму зварот да комплексу расавых ідэй у беларускім нацыяналізме выглядае дзіўным, і практычна гэта — табуяваная тэма. Хоць мы схільныя рэтраспектыўна асуджаць расізм, але гістарычна карэктна разглядаць інтэлектуальныя феномены ў кантэксце іх існавання, без наслойвання пазнейшых значэнняў. Мяркую, што ігнараванне гэтых ідэй шмат у чым спрашчае наша разуменне беларускага інтэлектуальнага ландшафту, як часткі ўсходнееўрапейскай інтэлектуальнай культуры, з яе плюсамі і мінусамі.

Трэба мець на ўвазе, што ў канцы XIX стагоддзя расавыя ідэі былі цалкам рэспектабельнымі для інтэлектуальнага асяроддзя Заходняй Еўропы. Яны былі цесна звязаны з пазітывісцкім праектам фізічнай антрапалогіі, і разам з тым — паўставаннем такой навукі як еўгеніка (з вельмі спрэчнай сучаснай рэпутацыяй)[2].

Што істотна, панятак «арыйскай расы» выкарыстоўваўся для выбудоўвання сімвалічнай іерархіі еўрапейскай вышэйшасці, апраўдання панавання еўрапейскага каланіялізму над расамі, якія ўспрымаліся ніжэйшымі. То-бок, у працах найбольш аўтарытэтных аўтараў на расавую тэматыку (Жазэф Арцюр дэ Габіно, Х'юстан Сцюарт Чэмберлен) арыйская раса звязвалася з пазітыўнымі каштоўнасцямі — асаблівасці фізічнай будовы былі цесна звязанымі з ментальнымі характарыстыкамі, арыйскай расе прыпісваўся ствaральны і прадпрымальны дух, любоў да вольнасці і творчыя здольнасці. Адпаведна, іншыя расы ўспрымаліся як інтэлектуальна і фізічна адсталыя, што апраўдвала

[1] У кантэксце дадзенага артыкула пад расавымі ідэямі разумеюцца погляды, дзе асаблівая ўвага надаецца антрапалагічным асаблівасцям супольнасцей, якія разглядаюцца ў межах расавых класіфікацый. Расізм успрымаецца як больш вузкі комплекс ідэй, для якога прынцыповым з'яўляецца пабудова культурных іерархій паводле расавых прыкмет. То-бок, расізм узнікае, калі адны расы прызнаюцца лепшымі/вышэйшымі, іншыя — горшымі/ніжэйшымі.

[2] R. W. Sussman, *The Myth of Race*, Cambridge — London 2014; N. Stepan (ed.), *The Idea of Race in Science. Great Britain 1800-1960*, London 1982.

панаванне еўрапейцаў («арыйцаў») над імі, па сутнасці, гэта была легітымацыя імперыялістычнай эксплуатацыі пазаеўрапейскіх (і ў некаторых выпадках — еўрапейскіх) народаў[3]. Але пры прасоўванні на Усход арыстакратычная і панаднацыянальная канцэпцыя расавага вяршэнства шмат у чым трансфармавалася, і ўжо ў нямецкім выпадку была інструменталізавана для апраўдання нацыянальнага прыгнёту, найперш славянскіх меншасцей. Такая нацыяналізацыя расавай праблематыкі ад немцаў перадалася шмат якім народам Усходняй Еўропы.

У дадзеным дакладзе я хачу спыніцца на з'яве трансферу ідэй, калі інтэлектуальныя канструкцыі, створаныя ў вызначаным кантэксце, пераймаліся ў іншым культурна-палітычным асяроддзі з абсалютна адрознымі задачамі і мэтамі.

Адпаведна, калі ідзе гаворка пра перайманне расавай праблематыкі (зноў жа, вельмі пашыранай і досыць рэспектабельнай у Еўропе канца XIX — пачатку XX стст.) у тагачасным беларускім кантэксце, то заўважны цалкам іншыя патрэбы, мала звязаныя з апраўданнем вышэйшасці белага чалавека.

Найбольш мяне цікавіць, як расавая тэматыка была выкарыстана першапачынальнікамі беларускага нацыяналізму, для якіх галоўная задача была пазначыць права беларускага народа «людзьмі звацца» і «заняць пачэсны пасад між народаў». Гэтым палітычным задачам адпавядала стварэнне нацыянальнай гістарыяграфіі, якая даказвала, што даўнія традыцыі беларускай дзяржаўнасці даюць ім права выяўляць патрабаванні на аднаўленне дзяржаўнасці ў сучаснасці. Па сутнасці, мова ідзе пра контрімперскі праект, які ўзнік як форма супрацьстаяння практыкам нармалізацыі «беларускага пытання» расійскімі ўладамі. І як ні дзіўна — для вызначэння адрознасці беларусаў ад рускіх апроч культурна-гістарычнай выкарыстоўвалася і расавая рыторыка, якая таксама дазваляла стварыць штучную іерархію, дзе беларусам нарэшце можна было заняць прывілеяваную пазіцыю (у адрозненне ад рэальнай сацыяльна-палітычнай сітуацыі).

Паколькі станаўленне беларускага нацыянальнага руху немагчыма разглядаць ізалявана ад імперскіх практык кантролю, то ў дадзеным выпадку важна адзначыць, што расавая праблематыка таксама скарыстоўвалася і ў навуковых праектах расійскай улады для апісання і класіфікацыі народаў і зямель.

Першыя расава-антрапалагічныя даследаванні мясцовага насельніцтва разгортваюцца як праекты імперскай расалогіі ў другой палове XIX стагоддзя, і кладзіся ў больш агульныя задачы. У афіцыйнай ідэ-

[3] T. McCarthy, *Race, Empire and the Idea of Human Development*, Cambridge 2009.

алогіі Расійскай імперыі беларускія землі разглядваліся як вернуты рускай дзяржаве тэрыторыі, спрадвечна яму прыналежныя. Але фактычныя адрозненні ад ідэальнага тыпу рускага чалавека трэба было неяк патлумачыць — яны прыпісваліся часаваму «забруджванню», чужародным уплывам польскага духу (і крыві), каталіцызму і габрэйскіх мігрантаў, якія «сапсавалі» не толькі мову, але і расавы тып мясцовага насельніцтва. «Вывучыць уплыў „примесей посторонней крови” ў Паўночна-Заходнім краі» — такая задача была пастаўлена кіраўніком маскоўскага Імператарскага таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі (Императорского общества любителей естествознания, антропологии и этнографии) Анатолем Багданавым[4]. У другой палове XIX — на пачатку XX стагоддзя менавіта гэта таварыства было асноўным цэнтрам навуковай фізічнай антрапалогіі, якая арыентавалася на заходнія ўзоры расавай антрапалогіі і арганізоўвала мноства экспедыцый для збору антрапалагічнага матэрыялу[5]. Шмат палявых экспедыцый праводзілася і на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Па выніках адной з першых антрапалагічных экспедыцый, праведзенай Мікалаем Янчуком па Менскай губерні ў 1886 годзе ў якасці адметнай рысы беларусаў была вылучана «скуластость». Дадзеныя мангалоідныя рысы тлумачыліся магчымым змешваннем з мясцовымі татарамі. Шырэйшая адлегласць між вачамі беларусаў таксама надавала іх тварам «монголоидное выражение»[6]. Яўген Эйгхольц у сваёй дысертацыі пра антрапалагічны тып беларусаў Раслаўльскага павета[7] (1896 год) таксама прыходзіць да высновы пра змешаны расава-антрапалагічны тып беларусаў, дзе прысутнічаюць выразныя мангольскія рысы: «Современное население Рославльского уезда представляет из себя смешанную народность, у которой признаки европейских светло- и темноволосых типов чередуются с признаками, свойственными монгольской крови». Да расавых прыкмет мангольскай крыві ў беларусаў, па меркаванні Эйгхольца, адносяцца: «значительная ширина межглазничного пространства, большая величина межскулового расстояния, редкая растительность

[4] Гл.: О. Марфина, *История антропологических исследований в Беларуси,* Минск 2015, с. 11.

[5] М. Могильнер, *Homo Imperii. История физической антропологии в России (конец XIX — начало XX века)*, Москва 2008.

[6] Н. Янчук, *Некоторые данные к вопросу об антропологическом типе белорусов*, «Известия Императорского общества любителей естествознания, антропологии и этнографии», Москва 1890, т. LXVIII, вып. III, с. 68.

[7] На той момант Раслаўльскі павет уваходзіў у Смаленскую губерню, зараз Раслаўль — раённы цэнтр Смаленскай вобласці (Расійская Федэрацыя).

на щеках, относительно большая величина таза, небольшая (...) длина нижней конечности, а таксама небольшая величина горизонтальной окружности головы»[8].

У цэлым у расалагічных даследаваннях беларусаў часоў Расійскай імперыі яўна дамінавала парадыгма «змяшанасці», адмова ад чыстых і ідэальных тыпаў, і ў межах такой парадыгмы беларусы разглядаліся як цікавы выпадак гібрыдызацыі расавых асаблівасцей на заходнім памежжы дзяржавы. З іншага боку, трэба разумець, што ў працах маскоўскага антрапалагічнага таварыства цяжка вылучыць расісцкую ідэалогію, паколькі змяшанасць не супрацьпастаўлялася «чыстай крыві», не выбудоўваліся іерархіі розных народаў у адпаведнасці з расавымі прыкметамі. Вялікаросы разглядаліся такімі ж змяшанымі, як і мноства іншых народаў, што насялялі бязмежныя абшары Расійскай імперыі. Такі навуковы праект расавай антрапалогіі яўна меў імперскі характар, паколькі супрацьстаяў розным стратэгіям выключнасці і размежавання, мусіў інтэграваць розныя катэгорыі насельніцтва ў адзіны дзяржаўніцкі праект.

Натуральна, гэта патрабавала інтэлектуальнага адказу з боку маладога беларускага нацыянальнага руху. Праводзіць уласныя антрапалагічныя даследаванні было практычна немагчыма, таму змаганне разгортвалася не ў плане навуковых дыскусій, а ў плане ідэалогіі, дзе «змяшанасці» беларусаў была супрацьпастаўленая абсалютна супрацьлеглая ідэя: прымардыяльнай чысціні беларусаў як самага чыстага славянскага тыпу (з гэтай ідэяй таксама гарманіравала ідэя пра арыйскае паходжанне беларусаў). Расавыя ідэі цесна змешваліся з новымі тэорыямі этнагенезу беларусаў, якія мелі галоўную практычную задачу — выбудаваць максімальную культурную і гістарычную дыстанцыю беларусаў з рускімі.

Хоць парадыгма змяшанасці дамінавала ў коле маскоўскіх антраполагаў, тым не менш не была паноўнай нават у межах імперскай навукі, пра што сведчыць прыклад вядомага і аўтарытэтнага мовазнаўцы Яўхіма Карскага, аўтара фундаментальнай працы «Белорусы». У першым томе гэтай працы, апублікаваным у 1903 годзе, для вызначэння старажытнага насельніцтва беларускіх зямель ён таксама шмат у чым абапіраецца на антрапалагічныя прыкметы (доўгагаловасць, светлыя валасы, блакітныя вочы), але інтэрпрэтуе гэтыя прыкметы зусім у іншым ключы — як прыкметы захаванасці знешняга

[8] Е. Эйхгольц, *Материалы к антропологии белоруссов. Рославльский уезд. Диссертация на степень доктора медицины*, Санкт-Петербург 1896, с. 154.

выгляду старажытных індаеўрапейцаў, з якіх пазней сфармаваліся славяне, «более чистыми представителями которых в отношении антропологическом в настоящее время являются белорусы»[9]. Прычыны кансервацыі антрапалагічных прыкмет беларусаў Карскі бачыць у геаграфічных асаблівасцях дадзенай тэрыторыі. Гэты матыў пазней будзе досыць часта паўтарацца і іншымі аўтарамі: «Занятая ими страна теперь и особенно в старину отличалась вследствие своих обильных болот и лесов малодоступностью; а неудобная почва еще более отвлекала от нея внимание соседей»[10]. Але Карскі не лічыць гэтыя адметнасці беларусаў нагодай супрацьпастаўляць іх рускім. Ён упарта вытрымлівае лінію разгляду беларусаў як часткі больш агульнай супольнасці рускіх: старажытнасць антрапалагічных прыкмет беларусаў толькі больш праяўляецца ў беларусаў, але гэтыя ж рысы і паходжанне таксама ўласцівыя рускім.

Можна лічыць, што Мітрафан Доўнар-Запольскі быў першым, хто канцэптуальна выкарыстаў ідэю чысціні паходжання для палітыкі ідэнтычнасці, сутнаснага адрознення беларусаў ад вялікаросаў і маларосаў (і абгрунтоўваў гэта з дапамогай уласных гістарычных і этналагічных штудый). У этнаграфічным нарысе беларусаў, апублікаваным у 1905 годзе, заснавальнік беларускай акадэмічнай гістарыяграфіі Мітрафан Доўнар-Запольскі сцвярджаў, што беларусы ўяўляюць сабою «едва ли не самый чистый тип славянского племени». Нават «скуластость», якая так кідалася ў вочы імперскім антрапалагам і якія адносілі яе да выразных мангалоідных рысаў, «нисколько не портит общаго впечатления». Беларускае племя, па меркаванні Доўнар-Запольскага, ніколі не злівалася з іншымі народнасцямі, у адрозненне ад вялікарусаў, якія занялі фінскія землі і змяшаліся з мясцовымі плямёнамі, а «малорусское племя представляет собой очень пеструю смесь древне русских племен с тюркскими народностями»[11]. Гэтая ідэя выключнай чысціні паходжання беларусаў, якая адсутнічала ў ранейшых працах беларускага гісторыка (у тым ліку, у праграмным артыкуле 1888 года «Белорусское прошлое») набывае надалей сталае жыццё. У кароткім нарысе «Асновы дзяржаўнасці Беларусі» Доўнар-Запольскі зноў прынцыпова сцвярджае, што беларусы — гэта адзіны народ, які «не набраўся чужыцкіх элементаў», таму «беларусы

[9] Е. Карский, *Белорусы*, т. I: *Введение в изучение языка и народной словесности*, Варшава 1903, с. 34.

[10] Там жа, с. 33.

[11] Цытуецца паводле: М. Довнар-Запольский, *Белоруссы. Этнографический очерк*, [у:] *Исследования и статьи,* Киев 1909, с. 259.

становяць найбольш чыстае славянскае племя, захаваўшае і зьверхны выгляд славяніна, і шмат адзнак яго псыхікі і быту»[12]. У пазнейшым манаграфічным рукапісе «Гісторыі Беларусі», створаным у 1925-1926 гадах, але па палітычных прычынах так і не апублікаваным у Савецкай Беларусі, Доўнар-Запольскі наноў вяртаецца да сваёй ідэі пра беларусаў як «наиболее чистом славянском племени», в «историческом прошлом Белоруссии нет никаких элементов скрещивания», ізноў жа, у супрацьлегласць украінцам (у якіх «много примесей тюркской крови»), і «великорусского племени», которое «явилось результатом скрещивания славянского племени с финнами и тюрками»[13].

Цікава, што гэты карэнны зрух ад імперскага да нацыянальнага погляду на «чысціню» беларусаў можна знайсці і ў асобе Мікалая Янчука, які быў характэрным медыятарам між гэтымі двума тыпамі веды, што адлюстроўваецца і ў яго біяграфіі. Тут ужо згадваліся вынікі яго антрапалагічных экспедыцый, выкананых у парадыгме «змяшання», і ў дадзеным выпадку гэта цалкам адпавядала яго інстытуцыйнай прыналежнасці — з 1889 па 1903 год ён быў сакратарам аддзялення этнаграфіі маскоўскага Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі, з 1901 года — стваральнікам і кіраўніком Музычна-этнаграфічнай камісіі гэтага таварыства, адным з заснавальнікаў часопіса «Этнографическое обозрение». Але з Кастрычніцкай рэвалюцыяй яго акадэмічная кар’ера набывае нечаканы паварот: ужо ўлетку 1918 года ён чытае лекцыі ў Беларускім народным універсітэце ў Маскве, уключаецца таксама ў дзейнасць Беларускага навукова-культурнага таварыства ў Маскве і нават кароткі час (перарваны смерцю ад хваробы ў 1921 годзе) выкладае ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ў Мінску.

У яго выпадку асаблівую цікавасць уяўляе курс лекцый пра этнаграфію беларусаў, які і чытаўся ўлетку 1918 года ў Маскве. Тут заўважны зрух да вызначэння беларусаў як чыстага славянскага тыпу, што вылучае іх у параўнанні з велікаросамі і маларосамі. Што цікава, Янчук злучае ў сваёй аргументацыі як традыцыйныя для яго доказы (спасылкі на найноўшыя антрапалагічныя даследаванні, указанні на пашыранасць брахіцэфаліі ў беларусаў), з гістарыясафічнай логікай, сфармуляванай Мітрафанам Доўнар-Запольскім (Янчук і мусіў быць добра знаёмы з яго працамі, прынамсі з этнаграфічным нарысам 1905 года, які наўрад ці сакратар этнаграфічнага аддзела навуковага тава-

[12] М. Доўнар-Запольскі, *Асновы дзяржаўнасьці Беларусі*, 2-е выд., Вільня 1919, с. 4.

[13] М. Довнар-Запольский, *История Белоруссии*, Минск 2011, с. 24.

рыства мог абмінуць). Параўнаем: «великорусское племя, расширяясь на северо-восток, в течение многих веков впитывало в себя покоряемые им различные финские и татарские племена, а южно-руссы, ведя многовековую борьбу за степь на востоке, смешивались неизбежно с тюрками всякаго звания от печенегов до тюрок, а равно испытывали на себя влияние еще и других иноплеменников, каковы греки, готы, генуэзцы, молдаване, болгары, цыгане и пр. — белорусский народ, спрятанный в лесных пущах и защищенный малодоступными болотами и трясинами, спокон веков сохранял себя чистым от влияния чужой крови»[14]. З іншага боку Янчук яшчэ не ідэалізуе фізічныя рысы і асаблівасці характару беларусаў. Гэты крок будзе зроблены надалей.

У Савецкай Беларусі такі погляд на беларусаў быў не выключэннем, а хутчэй правілам. Мы можам яго знайсці ў асноўных працах па гісторыі (Усевалад Ігнатоўскі) і геаграфіі (Аркадзь Смоліч), якія выкарыстоўваліся ў якасці падручнікаў у 1920-я гады.

На пачатку свайго «Кароткага нарысу гісторыі Беларусі» Усевалад Ігнатоўскі[15] праграмна сцвярджае, што «беларускае племя праз увесь час свайго мінулага жыцьця ня зьлівалася з народнасьцямі другіх рас». Невялікія («этнаграфічныя») уплывы на беларусаў аўтар прызнае толькі за літоўцамі (якія такія ж «арыйцы», як і беларусы) і за палякамі. Натуральна, украінцы і рускія расавай чысцінёй не валодаюць, паколькі яны стагоддзямі пражывалі пад цюрка-мангольскім ярмом і актыўна змешваліся з гэтымі плямёнамі, апроч таго «вялікарускія пляменьні зьліваліся з фінамі»[16]. Мы бачым, што ў значнай ступені Ігнатоўскі ў дадзеным выпадку паўтарае канцэптуальную схему чысціні паходжання беларусаў, выкладзеную Доўнар-Запольскім, але ўзбагачае яе ўжо новай расалагічнай тэрміналогіяй (у тым ліку, прыпісвае беларусам «арыйскасць», якой не валодаюць іншыя суседзі, апроч літоўцаў). З іншага боку, і Доўнар-Запольскі, і Ігнатоўскі досыць асцярожныя ў сваіх сцвярджэннях, хоць у іх інтэрпрэтацыі чысціня славянскага паходжання беларусаў яўна валодае пазітыўнай вартасцю, але яны не выкарыстоўваюць эксплiцытнай расавай іерархіі, дзе чысціня паходжання давала б прыярытэт над змяшанымі расамі.

[14] Н. Янчук, *Этнографический очерк Белоруссии*, [у:] *Курс белоруссоведения: лекции, читанные в Белорусском народном университете в Москве летом 1918 года*, Москва 1918-1920, с. 152-184, 166.

[15] Адзначым, што Ігнатоўскі быў адным з ключавых прадстаўнікоў нацыянал-камунізму, займаў ключавыя пазіцыі ў акадэмічнай іерархіі БССР у 1920-е гг. (народны камісар адукацыі, прэзідэнт Акадэміі навук), а яго падручнік па гісторыі Беларусі выдаваўся пяць разоў дзяржаўным выдавецтвам Беларусі.

[16] У. Ігнатоўскі, *Кароткі нарыс гісторыі Беларусі*, 4-е выд., Менск 1926, с. 10.

Гэты ж тэзіс пра прымардыяльную чысціню беларусаў быў ключавым і для іншага важнага падручніка ў працэсе беларусізацыі адукацыі ў БССР — «Геаграфіі Беларусі» Аркадзя Смоліча. Антрапалагічныя асаблівасці беларусаў вызначаюцца тым, што гэта — найбольш чысты народ славянскага тыпу, і ў гэтым стаўленні яны супрацьпастаўляюцца ўсходняму маскоўскаму суседу:

«Сярод народаў Усходняе Эўропы беларус зьяўляецца найбольш чыстым прадстаўніком славянскага тыпу. Яго ўсходні сусед маскоўскі, або велікарускі народ вырас на фінскім грунце, паўстаў ад зьмяшаньня славянскіх колёністаў з манголамі — фінамі. Беларус спрадвеку сядзіць на сваей зямлі і гісторыя не памятаець на беларускім прасторы значнейшых неславянскіх тубыльцаў»[17].

Аргументы фізічнай антрапалогіі змешваюцца з культурнымі, і ў Смоліча ўжо падсвядома выбудоўваецца расавая вышэйшасць беларусаў над рускімі: «Будова цела ў яго (беларуса) крыху далікатнейшая, чым у маскоўца. Аб'яўляецца гэта і ў агульным яго выглядзе, і асабліва ў рысах твару — тонкіх і мягкіх, як і ў праўдзівага эўропэйца і славяніна»[18]. Натуральна, што з гэтага пасажу таксама вынікае адмаўленне еўрапейскасці і славянскасці рускіх (у тэрміналогіі Смоліча — маскоўцаў). Аналітычны інструментарый беларускага географа ў дадзеным выпадку набліжаецца да стандартаў расавай антрапалогіі, дзе асаблівасці знешняга выгляду сведчылі пра расавы характар і прыналежнасць да розных тыпаў культуры. Цікава, што Смоліч таксама не можа прамінуць тэму скуластасці беларусаў, але нават не толькі нармалізуе яе ў духу Доўнар-Запольскага, а, наадварот, выкарыстоўвае ў якасці антрапалагічнага маркера адрознасці: «скулы ў беларуса, прыкл., ня гэтак рэзка выдаюцца, як у татараў ды маскоўцаў»[19].

Дадзеныя прыклады сведчаць, што ўяўленні пра чысціню паходжання беларусаў (якая імпліцытна надавала ім вышэйшасць у параўнанні са змяшанымі тыпамі велікаросаў і малоросаў), у меншай ступені — пра арыйскасць як маркер еўрапейскасці беларусаў, былі асноватворнымі для ключавых падручнікаў па беларускай гісторыі і геаграфіі 1920-х гадоў. Але ва ўмовах Савецкай Беларусі мясцовыя

[17] А. Смоліч, *Географія Беларусі*, 2-е выд., Вільня 1922, с. 126. Развагі пра чысты славянскі тып беларусаў адсутнічаюць у першым выданні «Геаграфіі Беларусі» Аркадзя Смоліча, але там у выдання быў зусім невялікі аб'ём. Гэтыя развагі паўтараюцца ў трэцім віленскім выданні (1923 год), і пазней перабіраюцца ў публікацыі А. Смоліча ў БССР. Гл.: А. Смоліч, *Кароткі курс географіі Беларусі*, Менск 1926.

[18] А. Смоліч, *Географія Беларусі*, 2-е выд., с. 127.

[19] Там жа, с. 126.

нацыянал-камуністы не маглі адкрыта скарыстоўваць расісцкую рыторыку (хоць імпліцытна да яе звярталіся). Такіх абмежаванняў былі пазбаўлены аўтары, якія працавалі ў Вільні і Коўне.

Я маю на ўвазе найперш асяродак, які быў сфармаваны вакол Вацлава Ластоўскага і Янкі Станкевіча. Для мэт гэтага артыкула надзвычайную цікавасць уяўляе іх публіцыстыка паміж 1922-1926 гадамі, у перыяд актыўнага прасоўвання «крыўскай ідэі». Сам тэрмін «беларусы/Беларусь» для палітычнай і грамадскай мабілізацыі для іх выглядаў патэнцыйна слабым, таму была высунута альтэрнатыўная ідэя міфалагічнай Крывіі, старажытнай магутнай дзяржавы крывічоў, непасрэднымі нашчадкамі якога з'яўляюцца сучасныя беларусы[20]. Асяродак, сфармаваны вакол гэтых постацей, актыўна агітаваў за ўвядзенне новых этнонімаў (ці вяртанне старых, як паглядзець) — Крывія і крывічы. Праўда, у перспектыве гэтыя спробы апынуліся не дужа паспяховымі. Важным ідэйным кампанентам «крыўскага праекту» было адмаўленне ад сугучнай пары этнонімаў — велікаросы і беларусы — на карысць якасна адрозных назваў «маскалі» і «крывічы». Відавочна, што сюды закладвалася моцная інтэнцыя адасаблення беларусаў ад Расіі, дзе гістарычная (і расавая) аргументацыя служылі прагматычным мэтам палітычнага размежавання. Як тлумачыў заганнасць выкарыстання назвы Беларусь Вацлаў Ластоўскі: «Беларусы» — гэта пераходная ступень, часьць цэлага рускага, якое, як нам ведама, абаймае конглёмарат народнасьцяў самых рожнаякіх рас і плямён, ад Балтыку да Владзівастоку. У гэтай бязбрэжнай мозайцы мы як бела-русы будземо толькі нязначным, безындівідуальным камешкам, прызначэньне якога будзе стушавацца ў цэлым»[21].

Вацлавам Ластоўскім і Янкам Станкевічам было ажыццёўлена некалькі публікацый, якія былі накіраваны супраць уяўленняў пра антрапалагічную і культурную блізкасць беларусаў з рускімі, і шмат вагі ў такіх атаках надавалася расавай (і можна нават сказаць, расісцкай) аргументацыі. У 1923 годзе ў часопісе «Крывіч», які рэдагаваў Вацлаў Ластоўскі, Янка Станкевіч друкуе артыкул «Маскальшчына і Эўропа», у якім пытанні расавай прыналежнасці звязваюцца з цывілізацыйнай ідэнтычнасцю. Важнай новай ідэяй было не толькі надаванне беларусам (крывічам) статусу самага чыстага славянскага народа, але і выдаленне рускіх (маскалёў) са славянскай супольнасці, і зноў тут

[20] Гл. падрабязней: В. Корбут, *Тры вякі крыўскай ідэі*, «Druvis», 2005, № 1, с. 53-71.

[21] В. Ластоўскі, *Што спрыяе разросту і ўпадку народаў і дзяржаў,* [у:] *Выбраныя творы*, Мінск 1997, с. 390.

зліваюцца разам аргументы крыві і культуры. Паводле логікі Янкі Станкевіча, славяне з цывілізацыйна-культурнага гледзішча і па роднасці крыві адносяцца да больш шырокай супольнасці арыйскіх народаў, якія падзяляюць культуру Захаду. «Іншая справа Маскалі: у іх ня толькі ўсходняя цывілізацыя з тонкім заходнім колерам, але, як шчыра прызнаюцца «эўразійцы», няма Маскаля, у жылах якога не цякла б мангольская кроў»[22]. Вышэйшай культуры Захаду Станкевіч супрацьпастаўляе азіяцкі містыцызм, абшчыннасць, непраціўленне злу, характэрныя для светапогляду ўсходніх суседзяў.

У гэтым жа нумары (4/1923) часопіса «Крывіч» быў надрукаваны артыкул доктара А. Чужыловіча[23] «Мова, народ, раса», дзе псеўданавуковыя аргументы філалогіі зноў прыводзяць да ўжо вядомай нам высновы пра тое, што ў велікаросаў славянскі элемент знік у мангольскай крыві, але гэтая думка тут атачаецца расісцкай тэрміналогіяй: «Па крыві ж гэты манголы асталіся манголамі і не абярнуліся ў арыйцаў, яны — выражаючыся мовай індусаў — былі і асталіся «anarya» г.зн. «не арыйцамі», а «dasa» г.зн. «нізшай расай», ня гледзячы на хрысьціянства і славянскую мову». Адпаведна, дыстанцыя паміж беларусамі і рускімі (паводле аўтарскай тэрміналогіі — Крывічамі і Маскалямі) вырастае да гіганцкіх памераў, мова ідзе «аб розных народах прыналежачых у дадатку да розных чалавечых расаў — арыйскай і мангольскай»[24].

Сугучныя думкі выказвае Вацлаў Ластоўскі ў артыкуле «Аб „славянстве" маскалёў» (1926). Зноў мы бачым выкарыстанне той жа пары этнонімаў: крывічы і маскалі. Зноў расавая аргументацыя гучыць дзеля пазбаўлення рускіх (маскалёў) статусу прыналежнасці да славянскіх народаў. Аўтар прыводзіць прыклады прысутнасці на тэрыторыі Расіі неславянскага насельніцтва, каб прыйсці да высновы, што «цяперашняя Вялікарусія — гэта не славянскі край», а велікарусы — гэта мешаніна «на 999/1000 фінаў і татараў». Адрознасць беларусаў і рускіх пацвярджаецца і расава-антрапалагічнымі параўнаннямі: «пастаўце поплеч менчука з пензенцам і параўнайце: дзве саўсім іншыя расы людзей!»[25]. Такую ж характарыстыку «маскоўскай народ-

[22] Я. Станкевіч, *Маскальшчына і Эўропа*, [у:] *За родную мову й праўдзівы назоў*, Смаленск 2013, с. 73.

[23] Хутчэй за ўсё псеўданім, вельмі пашыраная практыка ў часопісе «Крывіч». Магчыма, сам рэдактар часопіса Вацлаў Ластоўскі хаваўся пад гэтым псеўданімам. У адрозненне ад большасці артыкулаў, якія перавыдаваліся ў розных зборах прац у незалежнай Беларусі, гэты артыкул застаўся па-за ўвагай, напэўна, занадта ўжо адыёзнай выглядала яго тэрміналогія і рыторыка.

[24] Д-р А. Чужыловіч, *Мова, народ, раса*, «Крывіч», 1923, № 4, с. 33-34.

[25] В. Ластоўскі, *Аб «славянстве» маскалёў*, [у:] *Выбраныя творы*, Мінск 1997, с. 383.

насці» Вацлаў Ластоўскі дае крыху раней: «будучы па мове славянскай, па крыві асталася фіна-татарскай»[26].

У сваім паэтычна натхнёным чытанні беларускай гісторыі («Лабірынты») Вацлаў Ластоўскі атаясамляе Крывію (прарадзіму беларусаў) з міфалагічнай Гіпербарэяй, прарадзімай старажытных арыяў. Пазней, у акупаваным нацыстамі Менску ў 1943 годзе выдаецца кампендыюм па гісторыі краіны «Беларусь учора і сяньня» Язэпа Найдзюка (перавыдадзены на пачатку 1990-х гадоў ужо ў незалежнай Беларусі), дзе са спасылкамі на нямецкага навукоўца Пашэ сцвярджаецца, што прарадзімай арыйцаў была Беларусь[27]. Агулам, погляды Вацлава Ластоўскага, з іх прыярытэтам крыві і паходжання, апынуліся дужа прыдатнымі для новай хвалі прапагандысцкіх публікацый, якія выпускаліся падчас нацысцкай акупацыі. Так, тэкст Ластоўскага з брашуры «Што трэба ведаць кожнаму беларусу» (1918), быў творча перароблены Язэпам Найдзюком для публікацыі спачатку ў Мінску (1943 год), а потым і ў Берліне ў 1944 годзе. Толькі да пачатковага катэхізіснага сцвярджэння: «Хто ёсьць беларусы? — Беларусы гэта народ славянскаго племя»[28], было дададзена кан'юнктурнае ўдакладненне: «Хто гэта беларусы? — Беларусы — гэта народ арыйскае расы, славянскага племя»[29].

Янка Станкевіч, які ў адрозненне ад Вацлава Ластоўскага здолеў пазбегнуць сталінскага тэрору, таксама мусіў адаптавацца да рэаліяў Трэцяга Рэйха. У 1941 годзе ў акупаванай нацыстамі Празе ён распрацоўвае для «карэспандацыйных курсаў беларусаведы» новы курс гісторыі Беларусі, дзе паходжанне крывічоў/беларусаў наўпрост злучаецца з арыйскай расай. Янка Станкевіч апісвае старажытную перадгісторыю як гісторыю змешвання арыйскіх народаў з даарыйскімі плямёнамі ў выніку перасяленняў, калі ў выніку асобныя арыйскія народы перасталі быць чыстымі. Але ў адрозненне ад рускіх і ўкраінцаў, якія паўсталі ў выніку змешвання з даарыйскімі народамі, беларусы сталі вынікам зліцця славян і балтаў, двух «чыстых» і «найболей блізкіх» арыйскіх народаў[30].

Гэты кароткі рэнесанс арыйскай праблематыкі ў працах беларускіх гісторыкаў перапыніўся разам з паразай Трэцяга Рэйха. Нават на

[26] В. Ластоўскі, *У. Пічэта. Гісторыя Беларусі*, [у:] *Выбраныя творы*, Мінск 1997, с. 380.

[27] Я. Найдзюк, І. Касяк, *Беларусь учора і сяньня*, Мінск 1943.

[28] *Што трэба ведаць кожнаму беларусу*, Менск 1918, с. 1.

[29] В. Ластоўскі, *Што трэба ведаць кожнаму беларусу*, выданьне трэйцяе, пашырыў Я. Найдзюк, Берлін 1944.

[30] Я. Станкевіч, *Курс гісторыі Крывіі-Беларусі*, [у:] *Гістарычныя творы*, Мінск 2003, с. 48-49.

эміграцыі расавая тэматыка ўжо практычна знікла, хоць той жа Янка Станкевіч і надалей працягваў інтэлектуальную актыўнасць.

Варта адзначыць, што прыцягальнасць расавых ідэй для самавызначэння беларусаў і іх адмежавання ад усходніх суседзяў не з'яўляецца ўніверсальнай рысай беларускай палітычнай думкі. Такі акцэнт на крыві і паходжанні быў характэрны найперш для лагера Вацлава Ластоўскага і Янкі Станкевіча, а таксама для часткі нацыянал-камуністаў. Але такі светапогляд быў цалкам чужым для шмат каго з вядучых прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху (браты Іван і Антон Луцкевічы, Адам Станкевіч і інш.). Можна казаць, што ў беларускім нацыяналізме ўжо ў 1920-я гады выявіўся яскравы падзел на этнічную і палітычную канцэпцыі беларускай нацыі, і выкарыстанне расавай рыторыкі з'яўляецца адным з маркераў дадзенага падзелу.

Разам з тым, застаецца некалькі важных пытанняў інтэрпрэтацыі абазначанага кола ідэй. Найперш, ці можам мы сказаць, што адаптацыя расавых ідэй у беларускі нацыянальны рух на пачатку XX стагоддзя была чымсьці ўнікальным? Адказ на гэта дае шведскі даследчык Пэр Андэрс Рудлінг, які сцвярджае, што «гэтыя ідэі не з'явіліся ў вакууме: Ластоўскі, Ігнатоўскі і іншыя беларускія нацыяналісты падзялялі расавыя наратывы пра мангольскую кроў рускіх з многімі польскімі і нямецкімі нацыяналістамі. Панятак альтэрнатыўнай «белай» славянскай групы, быццам вольнай ад мангольскага ўплыву, мусіць разглядацца ў кантэксце расавых дыскурсаў, пашыраных у Еўропе ў першай чвэрці XX стагоддзя. Прэтэнзіі на расавую чысціню і вобраз беларусаў як крайняга ўсходняга рубяжа еўрапейскай цывілізацыі мелі значэнне не толькі для рэпрэзентацыі беларускіх нацыяналістаў. Гэты наратыў быў часткова накіраваны і на ўнутранае спажыванне: нацыяналісты лічылі, што чыстае паходжанне можа павысіць унутраную самаацэнку і статус уласнай групы»[31]. Ідэі чысціні крыві і прыналежнасці да арыйскай расы не былі беларускім вынаходніцтвам, яны былі запазычаныя ва ўсходнееўрапейскім кантэксце і ўжо адаптаваныя пад мясцовыя патрэбы. З іншага боку, пакуль што цяжка адказаць пра канкрэтныя шляхі трансферу расавай праблематыкі ў творы беларускіх аўтараў — пакуль што на ўзроўні гіпотэзы ў якасці магчымых шляхоў можна пазначыць польскую публіцыстыку, дзе таксама актыўна (і значна раней, чым у беларускім кантэксце) абмяркоўвалася пытанне выключэння Расіі са славянскай супольнасці паводле расавых прыкмет. Можна згадаць пра погляды антрапола-

[31] P. A. Rudling, *The Rise and Fall of Belarusian Nationalism, 1906-1931*, Pittsburgh 2014, с. 51-52.

га-аматара Францішка Духіньскага (1816-1893), які абгрунтоўваў цывілізацыйную адметнасць рускіх ад іншых еўрапейскіх народаў расавым паходжаннем. На яго думку, менавіта раса вызначае апазіцыю дзвюх цывілізацый: усходняй, створанай праз мангольскую кроў, дзе дамінавала бяспраўе і дэспатызм, і заходняй, прадукту арыйскіх народаў, дзе паважаецца вольнасць і годнасць чалавека. Да гэтага досыць пашыраным у польскай публіцыстыцы было ўяўленне пра цывілізацыйную адметнасць Расіі, але менавіта Духіньскі (пад уплывам расалагічных прац Габіно) пачаў тлумачыць «неславянскасць» рускіх уздзеяннем мангольскай крыві[32].

Таксама ўважлівы чытач мог заўважыць, што ў межах гэтага артыкула практычна не было закранута пытанне антысемітызму, традыцыйна звязанага з расавымі ідэямі. Гэта можна патлумачыць асаблівасцямі беларускага нацыянальнага руху, дзе антысемітызм традыцыйна быў вельмі слабым. Беларускі нацыяналізм пры рытарычным апірышчы на вёску бачыў у габрэях пераважна саюзнікаў у барацьбе з царызмам, тады як асноўны вектар палітыкі ідэнтычнасці быў накіраваны на адмежаванне ад рускіх і палякаў[33]. З іншага боку варта пазбягаць ідэалізацыі ўзаемных стасункаў. Антысеміцкую рыторыку актыўна эксплуатавала Беларуская нацыянал-сацыялістычная партыя і яе выданне «Новы шлях» (1933-1937), але гэта пытанне патрабуе далейшага вывучэння. Прынамсі, для важнага ў гэтым даследаванні перыяду 1920-х гадоў расавая праблематыка выкарыстоўвалася найперш для адасаблення ад рускіх, і цяжка знайсці інвектывы, скіраваныя супраць габрэяў.

І, нарэшце, самае істотнае пытанне: ці дажылі ідэі чысціні крыві беларусаў да нашага часу, ці з'яўляецца актуальным супрацьпастаўленне «чыстых славян-беларусаў» і маскавітаў, змяшаных з фіна-уграмі і манголамі? Можна згадаць, што працы практычна ўсіх пералічаных аўтараў былі перавыдадзеныя ў 1990-я гады, і шмат у чым спрычы-

[32] K. Wrzesińska, *Ariowie i Turańczycy. Poglądy Franciszka Duchińskiego na temat rasy i cywilizacji*, „Sprawy Narodowościowe. Seria nowa», 2015 s. 46-63. Таксама гл.: M. Górny, *„Pięć wielkich armii naprzeciw wrogom naszym". Przyczynek do historii rasizmu*, „Kwartalnik Historyczny", 2011, nr 4, s. 681-706. Пра ўплыў Духіньскага на ўкраінскі інтэлектуальны кантэкст гл.: I. L. Rudnytsky, *Franciszek Duchiński and his impact on Ukrainian political thought, Essays in modem Ukrainian history*, Edmonton 1987, s. 187-202.

[33] Z. Šybieka, *Jews in Belarusian National Projects from the Beginning of the 19th Century till 1905 (Problem Setting)*, „Belarusian Political Science Review", Kaunas 2014, vol. 2, p. 102-115. Гл. Таксама: D. Staliunas, *Enemies for a Day: Anti-Semitism and Anti-Jewish Violence in Lithuania under the Tsars*, Budapest 2015.

ніліся да аднаўлення нацыянальнай гістарыяграфіі ў тым ліку. Але пытанне распаўсюджанасці расавых стэрэатыпаў у беларускай культурнай і інтэлектуальнай прасторы таксама яшчэ чакае паглыбленага даследавання.

**Summary**

**Racial Ideas in Belorussian Nationalism of the Beginnings of the Twentieth Century**

The article discusses how the notion of racial otherness of Belarusians and Russians emerged and has gradually developed. In Belarusian nationalist representations of the first decades of the twentieth century the Belarusians were attributed to the Aryan race (making them part of the European civilization), while the Russians were described as mixed a race and removed from the circle of the European culture. The article is an attempt to reconstruct the origin of these views, which can be traced in the Polish racial thinking. In fact, these views have had a role in delimiting the Belarusian and Russian national identities, but these stereotypes are active at the present time as well.

**Keywords:** racial difference, Belarusians, Russians, national identity.

**Streszczenie**

**Idee rasowe w nacjonalizmie białoruskim na początku XX wieku**

Artykuł przedstawia genezę i stopniowe upowszechnienie koncepcji rasowej odmienności Białorusinów i Rosjan. W białoruskim wyobrażeniu nacjonalistycznym w pierwszych dziesięcioleciach XX wieku Białorusinów zaliczano do rasy aryjskiej, co czyniło ich częścią cywilizacji europejskiej, natomiast Rosjan postrzegano jako rasę mieszaną, co wyprowadzało ich poza krąg kultury europejskiej. W artykule podjęta została próba zrekonstruowania pochodzenia tych poglądów, których źródła można znaleźć w polskiej myśli rasowej. Rzeczywiście poglądy, które odgrywały rolę w odgraniczeniu białoruskiej i rosyjskiej tożsamości narodowej, dochowały się w formie stereotypów do naszych czasów.

**Słowa kluczowe:** odmienność rasowa, Białorusini, Rosjanie, tożsamość narodowa.

**Alaksiej Łastouski** — kandydat nauk socjologicznych, pracownik naukowy Połockiego Uniwersytetu Państwowego. Zainteresowania naukowe: pamięć historyczna, tożsamość narodowa, historia intelektualna, historia nacjonalizmu.